Пастанова
Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь

22.08.2023 № 11

Аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“

На падставе пункта 2 Палажэння аб нагрудным знаку адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22 чэрвеня 2023 г. № 177, часткі пятай артыкула $32^1$ Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь Цэнтральная выбарчая камісія Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць форму пасведчання да нагруднага знака адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“ згодна з дадаткам.
2. Зацвердзіць Палажэнне аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“ (прыкладаецца).
3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з дня прыняцця.

Старшыня камісіі І.В.Карпенка

Сакратар камісіі А.А.Балдоўская

Дадатак
да пастановы Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь
22.08.2023 № 11

# ПАСВЕДЧАННЕ
## да нагруднага знака адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы”





Нагрудны знак адзнакі зацверджаны
Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
ад 22 чэрвеня 2023 г. № 177

ПАСВЕДЧАННЕ № ______

________________________________

________________________________

узнагароджаны(а)

нагрудным знакам адзнакі
Цэнтральнай выбарчай камісіі
Рэспублікі Беларусь

**«За асабісты ўклад
у развіццё выбарчай сістэмы»**

Старшыня камісіі

М.П.

Пастанова
Цэнтральнай выбарчай камісіі
Рэспублікі Беларусь
ад ______________ № ____

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Цэнтральнай выбарчай
камісіі Рэспублікі Беларусь
22.08.2023 № 11

ПАЛАЖЭННЕ
аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“

1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“ (далей, калі не вызначана іншае, – нагрудны знак).

2. Нагрудным знакам узнагароджваюцца члены Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь (далей, калі не вызначана іншае, – Цэнтральная камісія), іншых выбарчых камісій і камісій па рэферэндуме, работнікі апарату Цэнтральнай камісіі за шматгадовую добрасумленную працу, эфектыўнае выкананне задач па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў і рэферендумаў, іншыя асобы – за значны ўклад у развіццё выбарчай сістэмы Рэспублікі Беларусь, інфармацыйна-асветніцкую дзейнасць у галіне выбарчага права.

3. Узнагароджанне нагрудным знакам ажыццяўляецца па ініцыятыве:

Старшыні, намесніка Старшыні, сакратара Цэнтральнай камісіі ў дачыненні да суб’ектаў, прызначаных у пункце 2 дадзенага Палажэння;

кіраўнікоў структурных падраздзяленняў апарата Цэнтральнай камісіі ў дачыненні да работнікаў дадзеных структурных падраздзяленняў;

старшынь абласных, Мінскай гарадской выбарчых камісій, камісій па рэферэндуме ў дачыненні да членаў гэтых і ніжэйстаячых камісій;

кіраўнікоў арганізацый у дачыненні да работнікаў гэтых і (або) падначаленых арганізацый.

4. Прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам павінна ўключаць:

прадстаўленне па форме згодна з дадаткам.

характарыстыка з апошняга месца работы (вучобы).

5. Пытанне аб ўзнагароджанні нагрудным знакам разглядаецца на пасяджэнні Цэнтральнай камісіі, па выніках якога прымаецца рашэнне:

аб узнагароджанні нагрудным знакам;

аб адхіленні прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам.

6. У выпадку адхілення прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам ініцыятар узнагароджання інфармуецца аб гэтым.

7. Рашэнне аб узнагароджанні афармляецца пастановай.

Нагрудны знак адзнакі і пасведчанне да яго ўручаюцца ва ўрачыстай абстаноўцы Старшынёй Цэнтральнай камісіі або па яго даручэнні намеснікам Старшыні ці сакратаром Цэнтральнай камісіі.

Адначасова з нагрудным знакам уручаецца пасведчанне ўстаноўленага ўзору.

8. Асобам, узнагароджаным нагрудным знакам, выплачваецца аднаразовае грашовае ўзнагароджанне ў памеры да пятнаццаці базавых велічынь.

Работнікам апарату Цэнтральнай камісіі, узнагароджаным нагрудным знакам, аднаразовае грашовае ўзнагароджанне выплачваецца ў адпаведнасці з дзеючым ў Цэнтральнай камісіі палажэннем.

Іншым асобам, узнагароджаным нагрудным знакам, аднаразовае грашовае ўзнагароджанне выплачваецца па месцы іх работы за кошт сродкаў арганізацыі ва ўстаноўленым арганізацыяй парадку.

Дадатак
да Палажэння аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь ”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“

ПРАДСТАЎЛЕННЕ
да ўзнагароджання нагрудным знакам адзнакі
Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь
”За асабісты ўклад у развіццё выбарчай сістэмы“

1. Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (пры яго наяўнасці) ___________
____________________________________________________________________
2. Месца работы, займаемая пасада служачага (прафесія рабочага, занятак)
____________________________________________________________________
3. Чысло, месяц, год нараджэння ______________________________________
4. Адукацыя ____________________________________________________
5. Стаж работы ў Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь (для членаў Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь і работнікаў яе апарату) ____________________________________________________
6. Вопыт удзелу ў падрыхтоўцы і правядзенні выбараў, рэферэндумаў
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________
7. Звесткі аб узнагароджаннях Цэнтральнай выбарчай камісіі Рэспублікі Беларусь (чым, калі)______________________________________________
8. Заслугі, за якія прадстаўляецца да ўзнагароджання (адлюстроўваюцца прафесійныя, дзелавыя, асабістыя якасці, паказчыкі работы, іншыя паказчыкі, якія характарызуюць адпаведнасць патрабаванням пункта 2 дадзенага Палажэння) ______________________________________________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________
____________________________________________________________________

Пасада асобы, якая ўносіць прадстаўленне_______________ _______________ ______________________
______________________________ (подпіс) (ініцыялы, прозвішча)
______________________________

____________________ 20__ г.